**Дзяржаўная ўстанова адукацыі**
**“Рамязоўскі яслі-сад-сярэдняя школа Ельскага раёна”**

Трошка Л.Ф., настаўнік гісторыі

# Экскурсійны маршрут

# “Па чорным сцежкам вайны”

Маршрут пахода злучае чатыры вёскі, якія у часы Вялікай Айчыннай вайны знеслі пакуты ад рук нямецкіх акупантаў: Кочышчы - Жукі - Круглае - Копанка.

З фізіка-геаграфічнага пункта гледжання дадзены маршрут праходзіць па Мазырскаму Палессю у межах Ельскага адміністрацыйнага раёна. Вышыня мясцовасці вагаецца ад 125-ці да 135-ці метраў над узроўнем мора. Закранутая маршрутам тэрыторыя знаходзіцца ў бассейне ракі Чэрцень, якая ўпадае ў Славечна, што нясе свае воды ў Прыпяць. Мясцовасць складзена старажытнымі водна –ледніковымі пяскамі часоў Сожскага зледзянення. Маладыя поклады фарміруюцца ў катлавінах сучасных балот і ў даліне р. Чэрцень.

Дадзеная геамарфалагічная абстаноўка, у тым ліку слабы дрэнаж тэрыторыі, абумовілі развіццё пэуных тыпаў глеб. На большасці тэрыторыі (заходні і цэнтральны сектары маршрута), пераважаюць дзярнова-падзолістыя глееватыя глебы пераважна на пясках і супясках. Тут атрымалі развіццё субаравыя лясы з дамешкамі бярозы барадаўчатай. У даліне р.Чэрцень (усходні сектар маршрута) развіваюцца поймавыя алювіяльна-дзярнова-глеявыя глебы з заліўнымі лугамі і астравамі нізінных балот. У межах адзначанай тэрыторыі мазаічна пашыраны пераходныя і нізінныя балоты на тарфяна-балотных глебах. Расліннасць балот пераважна тарфяніста-дрэвавая з шэрай альхі, пушыстай бярозы, сасны і багульнікам, асакой, зялёным імхом у травяністым покрыве.

Значныя плошчы былых лясоў і балот навокал вёсак падвергліся меліярацыі, што прывяло да агульнага апускання ўзроуню грунтовых вод і стварэнню асушаных тарфянікаў. Былая гідраграфічная сетка ператворана ў меліаратыўную сістэму, у якой значнае месца займае Качышчанскае вадасховішча і цэнтральны вадасборны клектар, што адыходзіць ад вадасховішча ва ўсходнім напрамку па восі Кочышчы – Жукі – Калінавая – Чэрцень. На асушаных плошчах праводзіліся вырубкі лясоў і стварэнне на іх месцы раллі, пашаў і сенажацей.

Маршрут пачынаецца з вёскі Кочышчы на ўсход па трасе Ельск-Скароднае. Першы прыпынак – вёска Жукі. Яна знаходзіцца ў дзвух кіламетрах ад Кочышч. На месцы сучвснага паселішча ў даўнія часы раслі сасновыя забалочаныя лясы. Вёска ўзнікла сярэдзіне XIX – га ст. На беразе маленькай рачулцы, што ўпадае ў Чэрцень пасля меліаратыуных мерапрыемстваў яна пераўтварылася ў цэнтральны вадасборны калектар. Увогуле асушэнне балот закранула вялікія навакольныя плошчы, - і на месцы старажытных лясоў узнiклi ўрадлівыя сенажаці і пашы.

Вёска Жукі стала вядомай не толькі на Беларусі, але і на ўвесь Савецкі Саюз у сувязі з падзеямі Вялікай Айчыннай вайны. Летам 1943 г. У Жуках размяшчалася нямецкая карная вайсковая часць, у былых калгасных хлявах расстраляна больш за 3500 тысяч мірных жыхароў навакольных вёсак. У памяць тых падзей у 1972 г. на магілах ахвяр фашызму ўстаноўлены помнік.

На усход ад вёскі за мастом маршрут пакідае асфальтавую шашу і накіроўваецца на поўнач па лясной дарозе. На працягу амаль чатырох кіламетрах цягнецца саснова-дубовы (субаравы) лес з сухадольнымі лугамі па баках дарогі на месцах вырубак. Мясцовасць паступова павышаецца і можна заўважыць, што колькасць дубу ў падлеску паспяхова памяньшаецца і ў наваколлі вёскі Круглае субары ўвогуле змяняюцца сановымі барамі.

Старая вёска Круглае была заснавана у пачатку XX – га ст. На участку зямлі, які меу круглую форму. Зараз аб гэтым мала хто сведчыць. 18-га ліпеня 1942 г. Акупанты спалілі Круглае і загубілі 41-го яе жыхара. Вёска пасля вай ны так і не адрадзілася. Памяць аб яе існванні і аб загінутых увекавечана ў мемарыяльным комплексе “Хатынь”. У 1972 г. на магіле ахвяр устаноўлена стэла.

Далей маршрут працягваецца па лясной дарозе на паўднёвы захад. Два кіламетры дарога праходзіць па сухім саснова-дубовым лясам са значнымі дамешкамі бярозы барадаўчатай, якая часткова ўтварае ярка выражаныя групоукі – бярозавыя гаі. На падыходзе да Копанкі дарога выходзіць на аткрытыя прасторы сухадольных лугоў, якія захаваліся вакол былой вёскі.

Копанка вядома з канца XIX – га ст. як хутар Скараднянскай воласці, які знаходзіўся ва ўласнасці тагачасных паноў Пасецкіх і Брадовічаў. У 1940 г. у вёсцы налічвалася 62 двары, 162 жыхары. 18-га ліпеня 1942 г. нямецка-фашысцкія захопнікі спалілі вёску і загубілі 186 яе жыхароў. Вёска не адрадзілася. Яна, таксама як і Круглае, увекавечана ў комплексе “Хатынь”. У 1974 г. на яе месцы ўстаноулены помнік ахвярам фашызму.

Ад Копанкі маршрут павяртаецца на поўдзень, да сваёй завяршальнай кропкі – вёскі Кочышчы. Дарога з лясной пераўтвараецца ў грунтовую і цягнецца спачатку праз часткова забалочаныя саснова-дубова-альховыя лясы

з вакенцамі пераходных балот на якіх растуць шэрая альха і пушыстая бяроза. Потым дарога спускаецца ў даліну цэнтральнага калектара, дзе навокал прасціраюцца асушаныя тарфянікі.

Маршрут завяршаецца ў вёсцы Кочышчы. Вёска знаходзіцца на пясчанай градзе, што цягнецца з поўначы на поўдзень, з дзвух бакоу сціснута балотамі, па якіх маудна сцякаюць воды ў Батыўлю і Чэрцень. На астравах сярод балот у даўніну раслі густыя лясы.

Кочышчы адзначаліся яшчэ на карце Рэчы Паспалітай канца XVII ст. У вёсцы існаваў касцёл, які пасля ўсталявання на гэтых землях царскай улады, пераўтварыуся ў царкву. Кочышчы на працягу свайго існавання значна выдзялялася сваім каспадарчым і культурным развіццём. На пярэдадні вайны ў вёсцы працавала адна з лепшых на Ельшчыне хата-чытальня.

У першыя дні Вялікай Айчыннай вайны амаль усе мужчыны былі мабілізаваны на фронт. Не вярнулася 75 вяскоўцаў, загінула 160 мірных жыхароў і партызан. Вёска была спалена карнікамі. Пасля выгнання захопнікаў у студзені 1944 г. у жыхароу вёсцы заставалася ўсяго некалькі кароў і свіней.

У памяць аб падзеях вайны ў Кочышчах быў устаноўлены помнік.

Адраджэнне вёсцы адбывалася значнымі тэмпамі. У 1947 г. райвыканкам прыняў рашэнне аб будаўніцтве ў Кочышчах узору паказальнага населенага пункта.

Дзякуючы таленавітым і ўпартым у сваёй працы старшынёй калгаса І.В. Дайняку, М.Ф. Прышчэпу, П.І. Цык, які ўзначальваў работу ў калгасе амаль чвэрць стагоддзя, вёска не толькі адрадзілася і заквітнела, але неўзабаве нярэдка станавілася пераможцам раённых і абласных спаборніцтваў. Удзельнік вайны, П.І. Цык шмат зрабіў, каб была захавана памяць аб земляках, якія загінулі на фронце і ў партызанскіх атрадах, расстраляны акупантамі.